рына КАМАРОВА,
агадчык кафедры педагогікі і методык
школьнага выхавання
Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта,
ндыдат педагагічных навук, дацэнт

# ДОБРЫЯ МАНЕРЫ

## РАГРАМА ДЛЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ

**У дашкольным узросце інтэнсіўна фарміруюцца рысы характару, засвойваюцца нормы і правілы паводзін, развіваюцца маральныя пачуцці дзяцей, пачынаюць усталёўвацца ўзаемаадносіны з дарослымі і раўнагодкамі. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на фарміраванне ў дзяцей правіл добрага тону (добрых манер).**

**Добрыя манеры—гэта правілы культуры паводзін, прынятыя ў грамадстве ў адносінах да сябе, іншых людзей, іх дзейнасці, прыроды і прадметаў побыту. Структура добрых манер для дашкольнікаў уключае: асабасную культуру (агульную і ў залежнасці ад полу дзіцяці);культуру дзейнасці (паводзіны ў гульні, працы, пры зносінах, на занятках); культуру зносін з дарослымі і раўнагодкамі; культуру адносін да прыроды і прадметаў, якія нас акружаюць (асабістага і грамадскага карыстання).**

**Добрыя манеры павінны фарміравацца з малодшага дашкольнага ўзросту з паступовым ускладненнем зместу да старэйшага ўзросту. Асноўныя ўмовы работы—цесная сувязь з сям'ёй і апора на індывідуальныя асаблівасці кожнага дзіцяці. Вядучыя метады і формы работы ў малодшым дашкольным узросце—прыклад выхавальніка і іншых дарослых, дыдактычныя гульні і гульні-заняткі з выкарыстаннем сюжэтнай лялькі, гульні-практыкаванні на добрыя ўчынкі, указанні і напаміны дарослых, індывідуальныя даручэнні маральнага характару. У старэйшым дашкольным узросце вядучымі ў рабоце з дзецьмі з'яўляюцца: этычныя ўрокі, чытанне мастацкай літаратуры на маральную тэматыку, разыгрыванне драматызаваных сцэнак лялечнага тэатра і сюжэтна-ролевых гульняў на пэўную тэму, рашэнне праблемна-маральных сітуацый, прагляд і абмеркаванне серыі карцін, дыяфільмаў, мультфільмаў на этычныя тэмы, вядзенне дзённіка добрых спраў, адкрыццё школы ветлівасці і добрых манер.**

### *ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ*

### *1. АГУЛЬНЫЯ АСОБАСНЫЯ МАНЕРЫ:*

- авалоданне культурна-гігіенічнымі навыкамі (чысціня цела і адзення, уменне самастойна і акуратна мыцца і апранацца, сачыць за чысцінёй твару, рук, ног, адзення і абутку);
- набыццё ўмення сачыць за сваёй знешнасцю (ахайна і з густам апранацца, прычэсвацца, сачыць за абуткам, звяртаць увагу на паходку, міміку, жэсты);
- набыццё ўмення паводзіць сябе ў грамадскіх месцах (правілы прывітання, падзякі, увага да іншых), асаблівасці паводзін у залежнасці ад месца (транспарт, вуліца, тэатр, бібліятэка, магазін і г.д.);
- валоданне культурай паводзін за сталом і прыёму ежы (сервіроўка стала, уменне карыстацца сталовымі прыборамі, паслядоўнасць прыёму ежы, манеры паводзін і зносін за сталом);
- набыццё ўмення паводзіць сябе ў гасцях і прымаць гасцей дома (правілы прывітання ў залежнасці ад узросту і ступені знаёмства, уручэнне і прыманне падарункаў, арганізацыя займальнай праграмы і інш.);
- фарміраванне неабходных маральных якасцей (праўдзівасць, спагадлівасць, павага адзін да аднаго, прыстойнасць, упэўненасць у сабе, натуральнасць, індывідуальнасць, шчырасць, самастойнасць, дысцыплінаванасць, адказнасць, арганізаванасць, добразычлівасць, гасціннасць, працавітасць і інш.).

### *2.ЖАНОЧЫЯ МАНЕРЫ (ДЛЯ ДЗЯЎЧЫНАК):*

- набыццё ўмення паводзіць сябе лёгка і нязмушана ў кампаніі раўнагодкаў;
- сачыць за сваёй знешнасцю, быць прывабнай, жаноцкай;
- прыгожа рухацца, танцаваць, дэкламаваць, музыцыраваць;
- быць добрай гаспадыняй і дапамагаць маці па хатняй гаспадарцы (прыбіранне кватэры, мыццё бялізны, догляд меншых дзяцей, прыгатаванне ежы, рамонт адзення і інш.);
- авалоданне некаторымі відамі "жаночай" працы (вязанне, вышыванне, пляценне, шытво, догляд пакаёвых раслін, упрыгожанне інтэр'ера);
- авалоданне тыпова жаночымі маральнымі якасцямі (дабрата, пяшчотнасць, сціпласць, абаяльнасць, пачуццё густу, любоў да дзяцей і інш.).

### *3. МУЖЧЫНСКІЯ МАНЕРЫ (ДЛЯ ХЛОПЧЫКАЎ):*

- набыццё ўмення прыстойна і з годнасцю паводзіць сябе сярод раўнагодкаў (не крычаць, не грубіяніць, не ўжываць сілу, не выхваляцца, не гаварыць лішняе і інш.);
- авалоданне навыкамі высакародных паводзін у адносінах да дзяўчынак (быць тактоўнымі і ўважлівымі, прапускаць дзяўчынку наперад, уступаць месца, аказваць дапамогу, першымі вітацца, умець рабіць кампліменты);
- авалоданне навыкамі паважлівых і добразычлівых адносін да маці, бабулі і іншых дарослых, а таксама да малодшых дзяцей (памагаць старэйшым і абараняць малодшых і слабейшых);
- развіццё навыкаў фізічнай культуры, заняткі спортам, развіццё разнастайных фізічных і маральных якасцей (смеласць, трываласць, рашучасць, знаходлівасць і інш.);
- авалоданне навыкамі "мужчынскай" працы (сталярна-цяслярныя работы, земляробства, канструяванне);
- авалоданне тыпова мужчынскімі маральнымі якасцямі (высакароднасць, мужнасць, пачуццё ўласнай годнасці, пачуццё абавязку, гуманнасць, шчодрасць і інш.).

### *4. ДОБРЫЯ МАНЕРЫ Ў ЗНОСІНАХ:*

- набыццё ўмення паважліва, добразычліва і натуральна весці размову, выклікаць прыхільнасць да сябе ў субяседніка, быць тактоўным, ветлівым у ходзе размовы;
- авалоданне культурай мовы і моўным этыкетам (гаварыць спакойным тонам, у нармальным тэмпе, у час размовы глядзець у вочы субяседніку, не жэстыкуляваць, не крыўляцца, не перабіваць, не траціць самавалодання, устрымлівацца ад непатрэбных слоў і выразаў);
- авалоданне асноўнымі формамі прывітання, развітання, звароту да людзей, падзякі, віншавання, спачування;
- набыццё ўмення весці размову, слухаць субяседніка, лаканічна выказваць уласныя думкі, спрачацца;
- авалоданне навыкамі зносін у залежнасці ад месца і часу сустрэчы, узросту субяседніка, сітуацыі.

### *5. ДОБРЫЯ МАНЕРЫ Ў ГУЛЬНІ:*

- набыццё ўмення гуляць спакойна, не перашкаджаючы адзін аднаму, праяўляць таварыскасць; падтрымліваць парадак у гульнявым кутку, беражліва

адносіцца да цацак і гульнявога матэрыялу; заахвочваць іншых дзяцей да гульні, справядліва размяркоўваць ролі, прытрымлівацца правіл гульні; быць уважлівым, добразычлівым у гульні, не перапыняць таго, хто гаворыць, у тактоўнай форме выказваць свае прапановы.

### *6. ДОБРЫЯ МАНЕРЫ Ў ПРАЦЫ:*

- выхаванне ўмення самастойна арганізоўваць сваё працоўнае месца, знаходзіць неабходныя матэрыялы для працы, рацыянальна іх выкарыстоўваць у рабоце; планаваць уласную працоўную дзейнасць і дамагацца мяркуемых вынікаў, творча падыходзіць да справы; узгадняць свае дзеянні з дзеяннямі іншых дзяцей, аказваць дапамогу адно аднаму.

### *7. ДОБРЫЯ МАНЕРЫ НА ЗАНЯТКАХ:*

- набыццё ўмення падтрымліваць у парадку працоўнае месца, самастойна рыхтавацца да чарговага занятку; слухаць педагога і раўнагодкаў, адказваць на пытанні і задаваць іх у тактоўнай форме; ветліва звяртацца за дапамогай і самому дапамагаць іншым дзецям.

### *8. ДОБРЫЯ МАНЕРЫ ПРЫ ЗНОСІНАХ З ДАРОСЛЫМІ:*

- вучыць клапаціцца аб іншых людзях (знаёмых і незнаёмых), быць уважлівымі і паслужлівымі (своечасова ўступаць месца, аказваць неабходную дапамогу, паслугу і г.д.); выконваць даручэнні дарослых, прыслухоўвацца да іх парад і патрабаванняў; першымі вітацца з дарослымі, дзякаваць за дапамогу, паслугу, пры выпадку ветліва прасіць прабачэння;выхоўваць любоў і адданасць да сям'і і блізкіх, вучыць аказваць ім пасільную дапамогу, уменню наладжваць адносіны са старэйшымі членамі сям'і.

### *9. ДОБРЫЯ МАНЕРЫ ПРЫ ЗНОСІНАХ З РАЎНАГОДКАМІ:*

- вучыць справядліва ацэньваць уласныя паводзіны і паводзіны іншых дзяцей; даверу і добразычлівасці адно да аднаго, уменню быць разам, аказваць дапамогу;
- вучыць заўважаць прыгожыя ўчынкі іншых дзяцей, у тактоўнай форме звяртаць увагу на памылкі.

### *10. ДОБРЫЯ МАНЕРЫ ПРЫ АДНОСІНАХ З ПРАДМЕТАМІ І РЭЧАМІ:*

- вучыць беражліва адносіцца да цацак, кніг, адзення, абутку, мэблі, посуду і іншых прадметаў асабістага і грамадскага карыстання, своечасова заўважаць і ліквідоўваць непаладкі ў іх;
- вучыць трымаць у чысціні і парадку рэчы і прадметы ў вызначаным месцы, акуратна адносіцца да іх, пасля карыстання класці на месца, выкарыстоўваць па прызначэнні;
- дабівацца ў тактоўнай форме выканання гэтых правіл ад сябе і ад іншых дзяцей.

### *11. ДОБРЫЯ МАНЕРЫ ПРЫ АДНОСІНАХ З ПРЫРОДАЙ:*

- вучыць заўважаць прыгажосць прыроды і любавацца ёю, заахвочваць рабіць прыроднае наваколле больш маляўнічым і прывабным;
- вучыць дапамагаць прыродным аб'ектам, асабліва ў перыяд росту, у цяжкі для іх час (рабіць кармушкі для птушак зімой, паліваць клумбы і агароды, калі няма доўга дажджу, нагортваць і ўтрамбоўваць снег каля дрэў у моцныя маразы і інш.);
- пазнаёміць з асноўнымі правіламі паводзін на прыродзе і дабівацца іх выканання ў жыццёвых сітуацыях (напрыклад, не засмечваць тэрыторыю, не ламаць дрэвы і кусты, не лавіць насякомых і птушак, не крычаць у лесе і г.д.).